# Прамова тав. Наталевіча Віктара Якаўлевіча

Таварышы! Працоўныя Слуцкай выбарчай акругі аказалі мне вялікае давер'е, вылучыўшы маю кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. Гэта давер'е, аказанае мне народам, я палкам адношу да партыі Леніна—Сталіна, членам якой я з'яўляюся ўжо 15 год.

**Таварышы! Мы жывем у краіне,** дзе пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, у жорсткай барацьбе з ворагамі, соцыялізм перамог канчаткова і беспаваротна. **Мы жывем у самай лепшай** краіне свету, дзе круглы год ззяе сонца Сталінскай Канстытуцыі, дзе працоўным краіна прадастаўляе ўсе свае багацці. Толькі ў нашай краіне чалавек з'яўляецца самым каштоўным капіталам; чалавек, які быў нікім, становіцца ўсім. Толькі ў краіне, кіруемай комуністычнай партыяй і геніяльным Сталіным, працоўныя вылучаюцца з нізоў на высокія пасты, займаюцца дзяржаўнымі справамі.

**Наша партыя** Леніна—Сталіна выхавала тысячы выдатных людзей—слаўных патрыётаў нашай радзімы. Многіх з іх народ з вялікай радасцю вылучае ў вярхоўныя органы ўлады з тым, каб яны працавалі яшчэ лепш для народа, для квітнеючай нашай радзімы. **(Апладысменты).**

Сесія ЦВК БССР зусім нядаўна выбрала мяне выконваючым абавязкі старшыні ЦВК БССР. Два месяцы таму назад я быў начальнікам палітаддзела №-скай часці, год назад — камісарам палка, тры гады назад—палітруком, 18 год назад—чырвонаармейцам.

Мяне, сына стрэлачніка, выхавала партыя Леніна—Сталіна. Радзіўся я ў 1909 годзе у вёсцы Верасвойша, Аршанскага раёна. У сям'і было 13 чалавек, а зямлі 2,5 дзесяціны. Цяжка было бацькам пракарміць сям'ю. Прышлося мне з малых год пайсці на заработкі. Спачатку прапаваў у маёнтку Забалоцце, потым на цвікавым заводзе, затым на чыгунцы, пісьмапосцам на пошце. Браты і сёстры таксама хадзілі на заработкі, батрачылі.

Жыць было цяжка.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы